ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 95 (1364) | НЯДЗЕЛЯ, 26-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 303.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

Месячнік баявой вясеньняй трывогі комсамолу

Узяць кожную гадзіну, што засталася да сяўбы, на ўлік

Тэрмін, тэмпы, ударніцтва, правільная расстаноўка і выкарыстаньне сродкаў вытворчасьці, цягавай і рабочай сілы,—вырашаць посьпехі сяўбы

Ва ўсе ўзброеньні ўключыцца ў масавы сеў

Рад раёнаў на поўдні Савецкай Беларусі пачалі сяўбу. Ік паведамлялася ва ўчарайшым нумары нашай газэты, колгас „3-ці інтэрнацыянал“, Лельчыцкага раёну, ужо адсеў 13 га. Праз 2—3 дні ў масавую сяўбу ўступяць усе колгасы і аднаасобны сэктар нашай рэспублікі.

Позьняя вясна скарачае тэрміны сяўбы. Плян вясеньняй сяўбы павінен быць выкананы. Патрэбна дакладная падрыхтоўка, напружаныя тэмпы работы, высокая продукцыйнасьць працы. Аднак, сучасны стан падрыхтоўкі не забясьпечвае гэтых паказчыкаў. Пляны ўтварэньня насенных і фуражных фондаў поўнасьцю ня выкананы. Плян кантрактацыі яравых выкананы толькі на 65,8 проц. Пераведзена на зьдзельшчыну менш паловы колгасаў. Слаба рыхтуецца аднаасобны сэктар.

Ацэнка, якую даў аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б), адзначыўшы, што фактычна ні колгасы, ні тым больш індывідуальны сэктар сельскае гаспадаркі да сяўбы не падрыхтаваны“,—застаецца і сёньня ў сіле.

2—3 дні, што засталіся да масавага выезду ў поле ўсіх колгасаў і аднаасобнікаў, трэба па-баявому скарыстаць, каб закончыць усе віды падрыхтоўчае працы.

Комсамольскія ячэйкі колгасаў павінны праверыць падрыхтаванасьць колгасаў да сяўбы.

Поўнасьцю і ў тэрмін выканаць плян вясеньняй сяўбы, забясьпечыць новы магутны прыліў у колгасы магчыма.

Узяўшы высокія тэмпы працы, даўшы высокую продукцыйнасьць працы, рацыянальна выкарыстаўшы сельска-гаспадарчыя машыны і інвэнтар, працоўную і цягавую сілу, толькі перавёўшы колгасы на зьдзельшчыну. ліквідаваўшы абязьлічку, прымацаваўшы кожную колгасную брыгаду да пэўнага вучастку, віду працы, а да кожнага колгасьніка—пэўную колькасьць с-гаспадарчых машын, інвэнтара, цягавае сілы і г. д.

Трэба зараз-жа ўзяць баявы разгон у рабоце, даць руйнуючы адпор опортуністым, якія ў зьвязку з скарочаньнем тэрміну сяўбы імкнуцца скараціць пасеўныя пляны. Плян павінен быць выкананы і перавыкананы.

Опортуністыя з Веткаўскага райкалгассаюзу зрываюць пераход на зьдзельшчыну

Большасьць колгасаў Веткаўскага раёну ня склала яшчэ рабочых плянаў вясеньняй сяўбы. Райколгассаюз недаацэньвае важнасьці вытворчых плянаў і не дапамагае складаць іх. Райколгассаюз зусім ня кіруе пераводам працы колгасаў на зьдзельшчыну. Пастановы 6-га зьезду саветаў і Колгасцэнтру аб пераходзе колгасаў на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх, не прапрацаваны ў колгасах. Ні адзін колгас ня мае норм выпрацоўкі.

Масавая палітвыхаваўчая праца па пераводу колгасаў на зьдзельшчыну не вядзецца. Ёсьць выпадкі калі паасобныя, больш адсталыя, колгасьнікі выступаюць супроць увядзеньня зьдзельшчыны, кажучы: „адразу перайсьці на зьдзельшчыну цяжка“ і г. д.

Партыйныя і комсамольскія ячэйкі слаба змагаюцца за пераход колгасаў на зьдзельшчыну і падрыхтоўку да вясеньняй сяўбы.

Колгасы, як „Вэзуві“ і інш., да сяўбы не гатовы. Ня складзены рабочыя пляны, брыгады, не пераведзена праца на зьдзельшчыну, няма норм выпрацоўкі, не адрамантаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар і машыны.

Пераважная большасьць колгасаў да гэтага часу не праверыла сваю гатоўнасьць да выхаду ў поле і толькі 3-4 колгасы правялі пробныя выезды.

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы ня ўвязана з організацыяй новага прыліву ў колгасы. Па большасьці колгасаў раёну зусім няма прыліву.

Райком партыі і райком комсамолу павінны ўжыць самыя рашучыя захады, каб узьняць тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы і пераходу колгасаў на зьдзельшчыну. Трэба ўдарыць гураганным агнём па опортуністычнай недаацэнцы складаньня колгасам рабочых плянаў і пераходу на зьдзельшчыну.

С. Ф. С.

ДОБРА ОРГАНІЗАВАНАЯ ПРАЦА ВЫКЛІКАЛА ПРЫЛІЎ

Колгас „Чырвоны Маяк“ (Слуцкі раён) падрыхтоўку да 2-й бальшавіцкай сяўбы закончыў. Пляны утварэньня насенфондаў перавыкананы. Складзены страхавыя і кармовыя фонды. Сельскагаспадарчы інвэнтар: плугі, бораны, сеялкі і збруя—адрамантаваны.

На 100 проц. выкананы плян кантрактацыі яравых пасеваў. Ліквідавана абязьлічка: цягавая сіла і інвэнтар прымацаваны да колгасьнікаў. Колгас пераведзены на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх, ячэйкай складзены нормы выработкі.

З пераводам на зьдзельшчыну ўзьнялася продукцыйнасьць у колгасе. Калі раней за 30 коньмі даглядалі 3 канюхі, дык зараз гэтую працу выконваюць удвох. Для дойкі 40 кароў раней патрабаваліся 4 жанчыны, зараз спраўляюцца 3. Колгасьнікі вельмі задаволены ўвядзеньнем зьдзельшчыны. „Хто колькі выпрацуе, хай за столькі і атрымае“—зьяўляюць яны. „Меньш будзе абібокаў“.

Падрыхтоўка да сяўбы цесна ўвязана з барацьбой за новы колгасны прыліў. 14-га красавіка комсамольская ячэйка наладзіла падворны абход беднякоў і серадннкоў вёскі. У выніку індывідуальнай апрацоўкі, за дзэнь уцягнута ў колгас 5 гаспадарак.

Канончык.

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва—парука бальшавіцкіх перамог

Колгас „Комбайн“ (Слуцкі раён) поўнасьцю падрыхтаваны да выхаду ў поле. Складзены апэрацыйна-вытворчы плян пасеву плянам прадугледжана засеяць: бульбы: 70 га на працягу 12-ці дзён аўса 60 га—за 8 дзён, лёну 8 га—за 2 дні, ячменю 20—га за 3 дні і г. д.

Насенфонды складзены поўнасьцю. Сельска-гаспадарчы інвэнтар адрамантаваны. Загатоўлена і вывезена для ўгнаеньня 300 пудоў вапны. Плян кантрактацыі колгас выканаў.

Складзены і зацьверджаны на сходзе нормы выработкі. З 1-IУ праца колгасу пераведзена на зьдзельшчыну. Організаваны 3 працоўныя брыгады па паляводзтву, агародніцтву і будаўніцтву, паміж якімі праводзіцца соцспаборніцтва. Складзены соцумовы.

Брыгадзір „Ч. З.“
Прывытак, Я

Паводка у БССР

РАСОНЫ, 24. 14 гадзін. Становішча паводкі, а 9 гадзіне раніцы вышэй ордынару. Адзінаццаць гадзін уночы зьнесены дом колгасу. Ахвяр няма. Убыткі 1.500 руб. Маюцца выпадкі размыцьця шляхоў, зьнясеньня мастоў дзяржаўнага значэньня. Насельніцтва мобілізавана на барацьбу з паводкай. Чакаецца значная прыбыль вады.

РАГАЧОЎ. Вада на Друці і Дняпру прыбывае. Дняпром падмыта 2 масты, прыняты меры па ліквідацыі прамыва. Ракой Друці мост цераз шосэ сарваны.

БЫХАЎ. Узровень вады 326. Пагражаючае становішча дамбам і мастам. Чыгунцы з боку Дняпра пагрозы няма. Працуе 260 падвод. Мобілізавана 300 чал. з суседніх вёсак. Дапамагае гарнізон.

ХОЦІМСК. Паводкай па раёну сарвана 6 мастоў. Разбурана 5 дамоў. Затоплена вадой у мястэчку 40 двароў. Агульная страта—35 тысяч рублёў.

ПУХАВІЧЫ. Работа па вастанаўленьні маста на перагоне Рудзенск—Пухавічы організавана. Прыняты меры да вастанаўленьня маста к 22 гадзінам.

СУРАЖ. Паводка у Суражы пагражаючая. Затоплена частка Суражу і рад вёсак. Організаваны перахватныя пункты.

ВУЛА. Мост праз Ульянку сарваны і знаходзіцца на прывязі. Вёскі Вулы эвакуіраваны. Меры барацьбы са стыхіяй прыняты.

БЕШАНКОВІЧЫ. Каля Друмаў устаноўлена дзяжурства. 6 вёсак часткова і поўнасьцю затоплены вадой. Масты цэлы. Тры да пачатку паводкі зьняты.

ЖЛОБІН. Узровень вады ў Дняпры хутка падымаецца. Затоплена шасэ Жлобін—Гомель. Пагражаючае становішча складам Саюзхлеба. Абвешчана трудгужпавіннасьць.

ЧАРЭЯ. Па раёну лёд прайшоў. Сарвана 6 мастоў. Размыты насыпі.

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. Паводка нябывалая. Пазрываны масты і грэблі. Зьнесена частка лесу. Прымаюцца захады.

ПУХАВІЧЫ, 24. 23 гадзіны. Становішча пагражаючае, ня гледзячы на тое, што вада убыла на 2 см. Станцыя Талька затоплена да сэмафора. Тэлефонная станцыя не працуе. Скот са станцыі перавезены. Вадой зьнесены плаціны і дамы. Мост чыгункі будзе адрамантаваны да 11 гадзін. Насельніцтву аказваецца дапамога.

Напярэдадні новых боек у Руры

БЭРЛІН, 24. У Эсэпе пачаліся перагаворы паміж прадпрыемцамі Рурскай камена-вугальнай прамысловасьці і прадстаўнікамі рэформісцкіх і каталіцкіх профсаюзаў. Прадпрыемцы настойвалі на тым, каб зарплата гарнякоў была зьніжана на 30-40 проц.

Перагаворы не прывялі да згоды, і на 4 мая назначаны новыя перагаворы, пад старшынствам урадавага трацэйскага судзьдзі. Не падлягае сумненьню, што зьніжэньне зарплаты ў новым тарыфным дагаворы будзе праведзена шляхам абвяшчэньня рашэньня трацэйскага суда абавязковым. Соцыял-фашысцкія профбюрократы будуць старацца прадставіць усю справу такім чынам, што быццам яны абаранялі інтарэсы гарнякоў, таму што формальна выступаюць за захаваньне старога тарыфнага дагавору. Рэволюцыйная профопозыцыя і чырвоны профсаюз гарнякоў цэнтр цяжару сваёй работы перанесьлі ў шахты і вядуць падрыхтоўку да абвяшчэньня забастоўкі.

Тэрор супроць комдэпутатаў

БЭРЛІН, 24. Вярхоўны суд у Лейпцыгу прыгаварыў комдэпутата рэйхстагу тав. Маддалена да 2 год зьняволеньня ў цытадэлі за „дзяржаўную зраду, учыненую пры дапамозе літаратурнай дзейнасьці“. Гэты прысуд—першы з раду ўсіх актаў судовага тэрору, якія будуць ужыты ў адносінах пазбаўленых дэпутацкай недатыкальнасьці комдэпутатаў.

Падрыхтоўка да дзіцячага тыдню

БЭРЛІН. З 1-га па 14-е мая ў Нямеччыне адбудзецца міжнародны дзіцячы тыдзень, які наладжвае нямецкая піонэрская організацыя „Юнгспартакусбунд“.

ГАНЕБНЫ ВЫПАДАК У ШКОЛЕ ФЗВ МЭТАЛІСТЫХ пры ЗАВОДЗЕ „УДАРНІК“

Уся грамадзкасьць павінна асудзіць хуліганаў

Патрабуем паказальнага суду

24-га красавіка г. г. былыя фабзайцы **Яцкевіч і Гіндзін** выключаныя са школы ФЗВ за хуліганства і падрыў працы ФЗВ, пабілі старшыню цэхпрофкому юнкора „Ч. З“. тав. **Гарбачэнка.**

Яцкевіч і Гіндзін на працягу ўсяго часу прабываньня у школе ФЗВ праяўлялі сябе агіднымі хуліганамі. У час заняткаў яны займаліся стрэльбамі, а Яцкевіч аднойчы вывесіў касьцяк селядца на дошку, як сымболь нашых цяжкасьцяй росту. У гэтай кампаніі ўдзельнічаў і былы комсамолец Кунцэвіцкі.

Калі-ж тав. Гарбачэнка на пасяджэньні школьсавету і іншых організацый падтрымліваў выключэньне іх са школы, дык група хуліганаў, паймаўшы яго на вуліцы, спрабавала яго зьбіць.

Учора ўвесь колектыў фабзавучу на сваім мітынгу рашуча асудзіў хуліганскі выпад Яцкевіча і Гіндзіна і падтрымаў рашэньне аб выключэньні іх са школы ФЗВ. Увесь колектыў патрабуе адданьня суду хуліганаў.

У адказ на хуліганскі выпадак група фабзайцаў: т. Грынгаўз, Кунда, Заніс і Пэйсаковіч колектыўна ўступілі ў комсамол.

Гэты факт сьведчыць аб надзвычайнай слабай, палітычна слабай выхаваўчай рабоце ў школе ФЗВ.

ПОЛІТВУЧОБА НА ЗАДВОРКАХ

Лёзьненскі і Копыські РК ЛКСМБ яшчэ не прыступілі да ліквідацыі політняпісьменнасьці

Узяць баявыя тэмпы па выкананьні пастаноў зьездаў—„у шасьцімесячны тэрмін ліквідаваць політняпісьменнасьць вясковага комсамолу“

Ня гледзячы на жорсткую пастанову ЦК УсеЛКСМ аб выкананьні ў тэрмін рашэньня 9-га зьезду па ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковага комсамолу, належнага пералому ў рабоце нашых комсамольскіх організацыі яшчэ не наглядаецца.

Опортуністычнай недаацэнцы значэньня аўладаньня комсамольцамі марксысцка-ленінскай тэорыі не даецца належнага адпору. Так, сэкратар Бечавіцкай саўгаснай ячэйкі Тарасевіч лічыць, што не яго справа займацца політвучобай. Сэкратар колектыву саўгасу імя Сталіна (Багушэўскі раён) заяўляе „няма з кім займацца, усе політычна-няпісьменныя, яны нават у романах не разьбіраюцца, куды ім да дакладу т. Якаўлева“.

Райкомы практычных мерапрыемстваў па забесьпячэньню ўсіх політ-гурткоў кіраўнікамі, літаратурай і перабудовай работы політсеткі ў сувязі з пачаткам палявых работ ня прымаюць.

Такое становішча па выкананьню аднаго з важнейшых рашэньняў зьезду надалей нецярпіма. Даволі слоў. ЦК ЛКСМБ павінен прасачыць за тым, як выконваюцца гэтыя пастановы зьезду і ўжыць рашучыя захады да ўсіх тых, якія не жадаюць і ня здольны іх выконваць

...„Куды ім да дакладу т. Якаўлева“

Політвучоба ў комсамольскім колектыве пры колгасе імя Сталіна, Багушэўскага раёну, пастаўлена з рук вон дрэнна. Сэкратар колектыву Гурэвіч, недаацэньвае політвучобу. Ён кажа: „Няма з кім займацца, усе політычна-няпісьменныя і нават у романах не разьбіраюцца,—куды ім да дакладу тав. Якаўлева“.

Такая права-опортуністычныя недаацэнка ліквідацыі політ-няпісьменнасьці стварыла ў працы колектыву рад прарываў. **Комсамолец.**

Галярэя зрыўшчыкаў політвучобы

Політвучоба ў Копыскім раёне—у загоне. Райком комсамолу ігнаруе рашэньні комсамольскіх зьездаў па пытаньню аб ліквідацыі політняпісьменнасьці. Зрыў політвучобы пропагандысты райкому т. Кулікаў узвальвае на комсамольскія ячэйкі, моў: у нашых комсамольскіх ячэйках пануе опортуністычная сьпячка, а „мы кіруем правільна“.

Калі комсамольцы местачковай ячэйкі сталі крытыкаваць Кулікава як вінавайцу ў зрыве політвучобы, дык сэкратар РК ЛКСМБ тав. Сьвяніцкі сказаў: „Крытыкаваць нас гэта глубства,—вінаваты вы“.

Політбой злачынна сарваны толькі таму, што РК ім не кіраваў, калі ня лічыць прысланых у ячэйкі кантрольных пытаньняў (больш паловы напісана на расійскай мове).

Па райкому раўняюцца і некаторыя сэкратары комсамольскіх ячэек. Так, у Старасельскай ячэйцы політвучоба сарвалася з-за таго, што кіраўнік гуртка тав. Шчэрбан ніколі ня прыходзіць на заняткі.

Сэкратар ячэйкі Каласоўскі ні разу ня ставіў пытаньне аб зрыве політвучобы на абгаварэньне бюро ячэйкі. І больш таго 19 красавіка быў організаваны політбой у Старасельскай ячэйцы, дык Каласоўскі адмовіўся прыйсьці, бо: „у мяне боты новыя, ды яшчэ лякам памазаны“.

Сэкратар Дуброўскай ячэйкі комсамолу зусім адмаўляецца ад політвучобы толькі таму, што і у ячэйцы няма чалавека, які-б мог кіраваць гуртком“.

Ударная брыгада „Ч. З.“
і пост Копыскай КК РСІ—
**Генін, Ро.ман, Арэшкаў
і Батурэвіч**

Да адказнасьці Зяневіча

У колгасе „Чырвоны маяк“ Слуцкага раёну па-баявому разгорнута распрацоўка пастаноў комсамольскіх зьездаў. Заняткі ў політшколе праводзяцца рэгулярна два разы на тыдзень. Сярод комсамольцаў, якія з ахвотай ліквідуюць сваю політ-няпісьменнасьць, ёсьць і такія, што імкнуцца сарваць гэту працу. Настаўнік-комсамолец Зяневіч, кіраўнік гуртка наведаў заняткі два разы. Калі комсамольцы зьвярталіся да яго за дапамогай разьвязаць цяжкія пытаньні, дык ён адказвае: „настаўніцкія справы каштуюць мне даражэй, чым вашы распрацоўкі“.

Комсамольцы ўжо некалькі раз зьвярталіся ў Райком, прасілі каб ён прымусіў Зяневіча працаваць у гуртку, але Райком прапусьціў гэта скрозь пальцы.

Райком, як відаць, сам ня цікавіцца становішчам політвучобы. Комсамольская ячэйка яшчэ не атрымала ніводнай брошуры па выніках комсамольскіх зьездаў. Няма брошур і ў кнігарнях раёну.

Комсамолец.

Усе комсамольцы ў політгуртку

Політвучоба ў Бацэвіцкай саўгаснай ячэйцы комсамолу зусім не наладжана. Былы сэкратар ячэйкі Тарасевіч на раз прыходзіў у Клічаўскі РК ЛКСМБ і заяўляў: „Пакіньце вы мне пасылаць цыркуляры, я ўсё роўна не магу займацца політвучобай.“

Райкому комсамолу вылучыў туды брыгаду, каб выявіць вінаватых у зрыве і адначасова наладзіць політвучобу.

Аказалася, што Тарасевіч на толькі не наладжваў політвучобу ў ячэйцы, але не прымаў ніякага ўдзелу ў гаспадарчых кампаніях, якія праводзіць партыя і ўрад.

Гэты кулацкі падпявала зараз выключан з комсамолу. Пасьля гэтага ячэйка павярнулася тварам да гаспадарчых задач, організавала брыгады па падрыхтоўцы да сяўбы; організавала адзін політгурток, якім ахоплены ўсе комсамольцы саўгасу.

С. Стальны.

Аб чым гаворыць агляд-праверка

„Чырвоная Зьмена“ правяла па Лёзьненскім раёне агляд-праверку як выканала комсамольская організацыя пастановы зьездаў КСМ аб ліквідацыі ў 6-месячны тэрмін політняпісьменнасьці вясковага комсамолу. Выявілася, што ў большасьці ячэек раёну політвучоба сарвана.

Так па трох ячэйках ЛКСМБ Грабоўскага сельсавету („Чырвоны сьцяг“, „Інтэрнацыянал“ і „Чырвоны Араты“) больш як два месяцы політгурткі не працавалі. Сэкратар ячэйкі „Чырвоны Араты“ ня ведае складу комсамольцаў, ня ведае як яны ахоплены політвучобай. Да выезду нашай брыгады пастановы зьездаў аб ліквідацыя палітняпісьменнасьці комсамольцаў ня былі прапрацаваны, не намечаны практычныя мерапрыемствы для іх выкананьня. Брыгада „ЧЗ“ правяла сход, дзе быў вылучан адказны організатар па політвучобе.

У двух ячэйках Сутоцкага сельсавету „1-га мая“ і „Інтэрнацыянал“ політвучоба сарвана. Кіраўнік школы Баскін, кандыдат партыі, сам не зьяўляецца на заняткі. Бюро ячэйкі бязьдзейнічае ў справе наладжваньня заняткаў політшколы, ня прымае мер да зрыўшчыкаў політвучобы.

Лепш наладзіла работу комсамольская ячэйка колгасу „Бязбожнік“ па ліквідацыі палітняпісьменнасьці вясковага комсамолу. Політвучобай ахоплены ўсе комсамольцы. Заняткі дагэтуль праводзіліся нормальна. За апошні час політзаняткаў ня было, у сувязі з тым, што кіраўніка школы перавялі на другую работу, а райкамол яшчэ не паклапаціўся вылучыць другога кіраўніка.

У коопэрацыйна савецкай і рабфакаўскай ячэйках палітвучоба сарвалася, што тлумачыцца опортуністычнымі адносамі комсамольцаў і кіраўнікоў гэтых ячэек да вывучэньня марксысцка-ленінскай тэорыі.

Такі-ж стан політвучобы і ў ячэйках Чарапіцкага сельсавету: „Чырвоны сьвет“, „Адказ ворагам“. саўгасу „Завольша“. На бюро ячэек і сходах ні разу ня ставілася пытаньне аб політвучобе.

Узорна пастаўлена палітвучоба толькі ў Капыльскай ячэйцы. Гэтай ячэйкай організаваны дзьве школы. Адна з іх—павышанага тыпу. Політвучобай ахоплены ўсе комсамольцы і шмат маладых колгасьнікаў. Наведваньне школ добрае. Добра пастаўлена распаўсюджваньне 6-цітомніка твораў Леніна. Ячэйка распаўсюдзіла 16 экз., замест вызначаных РК—4 экз.

„Чырвоная зьмена“ выпісваецца ўсімі комсамольцамі і беспартыйнай колгаснай моладзьдзю.

Ганебныя паказчыкі.

На заводзе „Зьвязда“ (Капцэвічы) у лістападзе 1930 г. была організавана комсамольская політшкола. Наведвалі яе толькі 5-7 чал. з агульнай колькасьці комсамольскай колектыву 120 чал.

Цех. ячэйкі і бюро колектыву нічога не робяць, каб ахапіць усіх комсамольцаў політвучобай.

Грышка Праўдзівы

Забясьпечыць кваліфікаванымі кадрамі морскі транспарт

МОСКВА, 24. — НКПраці СССР, улічваючы вялікае значэньне морскага транспарту для социялістычнага будаўніцтва і неабходнасьць забясьпечаньня яго кваліфікаванымі кадрамі, пастанавіў:

1. Адкамандыраваць на морскі транспорт:

а) асоб, якія вышлі на працягу 10 год з воднага (морскага ці рэчнага) транспорту, а менавіта: інжынэраў морскіх спэцыяльнасьцяй (інжынэраў-мэханікаў, інжынэраў-гідра... тэхнікаў, інжынэраў-карабельшчыкаў), капітанаў, штурманаў, суднамэханікаў, боцманаў, машыністых, мотарыстых і качагароў 1 клясы (у тым ліку і тых, якія працуюць зараз у якасьці вылучэнцаў).

б) асоб, якія скончылі на працягу апошніх 5-ці год ВУЗ'ы ці тэхнікумы па спэцыяльнасьці воднага транспарту, хаця-б яны не працавалі раней на водным транспорце.

Да юбілею „Ч. З.“ засталося 15 дзён

Менш параднасьці у падрыхтоўцы да юбілею, даеш канкрэтныя справы

„Чырвоная Зьмена“ праводзіць свой юбілей пад пунктам погляду ўздыму вытворчага энтузіязму працоўнае моладзі.

Комсамольскія організацыі, праводзячы падрыхтоўчую працу да юбілею, у першую чаргу павінны памятаць, што ступень падрыхтаванасьці комсамольскіх організацый да юбілею будзе вылічвацца ня колькасьцю слоў прыгожа сказаных у юбілейных вітаньнях, а практычна праробленай працай па ліквідацыі прарываў, у выкананьні прамфінпляну прадпрыемстваў, па організацыі новых ударных вытворчых брыгад і комун, па змаганьню комсамолу за аўладаньне тэхнікай, па садзейнічаньню і развіцьцю вынаходства і рацыяналізатарства сярод моладзі, па змаганьню за правядзеньне ў жыцьцё ўсіх мерапрыемстваў, высунутых „Ч. З.“.

Зараз юбілей „Ч. З.“ перанесены на 10-е мая. Кожная комсамольская організацыя павінна паставіць перад сабою мэту: да юбілею „Ч. З.“ прыйсьці з поўным выкананьнем прамфінпляну як па колькасных, так і па якасных паказчыках.

Гэта будзе лепшым падарункам юбіляру ад комсамолії і беспартыйнай моладзі.

Замацаваць дасягненьні

У адзнаку юбілею „Чырвонай Зьмены“ комсамольская організацыя ф-кі „Чырвоны тэкстыльшчык“ праводзіць адпаведную гадзіну для ліквідацыі прарываў прамфінпляну, які даў недавыкананьне на 39 пр.

Раней насьценгазэта выходзіла не рэгулярна, не змагалася з пасобнымі зрыўшчыкамі прамфінпляну. Юнкораўскай брыгады ня было.

Зараз організавана чырвонозьменаўская юнкораўская брыгада і наладжан сыстэматычны выпуск насьценгазэты сумесна з моладзьдзю ф-кі.

Вокунеў.

Кожны комсамолец чытае „Чырвоную Зьмену“

У 1924 годзе ў Драчкаўскім с-савеце (Смілавіцкі раён) організавалася комсамольская ячэйка з 4-х чалавек.

„Чырвоную Зьмену“ спачатку выпісаў толькі адзін комсамолец. Потым падпіска паступова пашыралася; у лютым 1931 году ячэйка ўзяла на сябе абавязак распаўсюдзіць не менш 100 экз. „Ч. З“, што ячэйка і выканала з гонарам.

Зараз у нашай ячэйцы няма ніводнага комсамольца, які-б ня чытаў „Чырвоную Зьмену“ „Чырвонку“ мы атрымоўваем практычную дапамогу кіраўніцтва ў сваёй працы.

Янкавец.

За выхоўваньне батрацкай моладзі

Падыходзячы да 10-гадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“, неабходна сказаць, што яна змагаецца за новы мэтод працы ў колгасах, за ўдарніцкі прыліў у іх бядняцка-серадняцкай часткі сялянства.

Недахопам „Чырвонай Зьмены“ зьяўляецца тое, што яна на сваіх старонках недастаткова асьвятляе жыцьцё сельска-гаспадарчых рабочых. Слаба кіруе пачынаючымі пісаць юнкорамі.

Неабходна ў далейшым праз газэту праводзіць заклік маладога батрацтва ў рады комсамолу і юнкораў і змагацца за 100-проц. уступленьне іх у колгасы.

Комар.

„Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай“ (Сталін)

Слухайце, таварышы спэцыялістыя

27-га красавіка, а 7 гадзіне ўвечары рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ склікае нараду спэцыялістых па пітаньню працы тэхнічнага кутку—кутку-консультацыі газэты „Чырвоная Зьмена“.

На нараду запрашаюцца ўсе спэцыялістыя, якія жадаюць прымаць удзел у выдаваемым газэтай тэхнічным кутку-консультацыі.

Пэрсанальна запрашаюцца т.т, Мядзьведзеў, Сьляпян і Баркан (ВЭА), Марголін, Малешкава, Ніфёдава (Белторф), Гольман, Камінскі, Айзэнберг, і Адэльскі (Будаб'яднаньне), Гайдаенка спэцыялістыяЛесбелу, Мэталяаб'яднаньня і Шклоаб'яднаньня.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі. (Вуліца Карла Маркса, 38).

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ. Друкарня імя Сталіна. Галоўлітбел № 599.